# РОЛЯ ЗВЯЗНАГА ТЭКСТУ Ў ВЫВУЧЭННІ ЧАСЦІН МОВЫ МАЛОДШЫМІ ШКОЛЬНІКАМІ

***Бароўская А.І.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *Н.А. Барысенка,канд. філал. навук, дацэнт*

Зварот да тэксту як да дыдактычнай адзінкі ўзнік перш за ўсё ў сувязі з развіццём звязнага мащлення вучняў, з неабходнасцю навучыць успрымаць і ствараць камунікатыўна-арыентаваныя тэксты ў працэсе працоўнай, вучэбнай, бытавой, грамадскай дзейнасці.

Сучасныя тэндэнцыі ў метадычнай працы з тэкстам патрабуюць яе ажыццяўлення на аснове маўленчых паняццяў, якія засвойваюцца не ў выглядзе азначэння паняццяў і фармулёвак правілаў, а ў выглядзе ўмення выконваць навучальныя дзеянні з гэтымі паняццямі і правіламі. Здольнасць адзінак мовы ўдзельнічаць у стварэнні тэксту, іх здольнасць звязваць усе яго часткі і асобныя сказы з улікам камунікатыўнага намеру таго, хто гаворыць, суцэльнага сэнсу, агульнай задумы называецца тэкстаўтваральнай функцыяй моўных адзінак. Гэтая функцыя праяўляецца на розных узроўнях.

Тэкставая аснова на розных этапах вывучэння сістэмы мовы можа быць прадстаўлена па-рознаму. Вывучэнне часцін мовы як лексіка-граматычных разрадаў слоў звязана з усведамленнем іх тэкстаўтваральных магчымасцей на ўзроўні афармлення змястоўнага боку выказвання: магчымасці ў перадачы разнастайных адценняў сэнсу, сінанімічныя формы і канструкцыі, стылістычная і эмацыйная афарбоўка і г.д. У самым агульным выглядзе шлях вывучэння часцін мовы на тэкставай аснове можна ўявіць такім чынам: сказ – аналіз марфалагічных катэгорый – тэкст.

Розныя часціны мовы па-рознаму ўдзельнічаюць у стварэнні тэксту, выконваюць тэкстаўтваральную функцыю, забяспечваючы разгортванне тэмы, кампазіцыйную і сінтаксічную яго арганізацыю.

Назоўнік з’яўляецца носьбітам значэння прадметнасці, яго ўжыванне ў тэксце забяспечвае “паўнату адлюстравання ў маўленні носьбітаў мовы матэрыяльнага і духоўнага свету”. Прыметнік – “рухавік” апісання. Пры дапамозе дзеясловаў прадметы паказваюцца ў руху, малюецца дынаміка дзеяння. Пры вывучэнні займенніка неабходна выпрацоўваць нормы яго ўжывання з падкрэсліваннем месца і ролі ў сказе і тэксце [1].

У ідэале кожны ўрок беларускай мовы павінен уключаць у сябе працу з тэкстам. Кожная граматычная тэма, кожная з’ява мовы павінна вывучацца на матэрыяле тэкстаў: тэорыя правяраецца на практыцы, вучні бачаць, як слова жыве ў тэксце, у мове.

**Літаратура**

1. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы. Маўленне : вучэб. дапам / В.А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2009. – С.118–158.

МГПУ им. И.П.Шамякина